**Пякуцька А.В.,** *прафесар*
**Клімовіч Л.А.,** *аспірантка*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ХАРАВОЕ МАСТАЦТВА Ў ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

Сярод розных відаў выхаваўчай дзейнасці асобнае месца займае эстэтычнае выхаванне, якое прадугледжвае развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы, навыкаў успрымання розных відаў мастацтва, прыгажосці прыроды і рэальнай рэчаіснасці ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокім сэнсе слова, уменне даць ім правільную эстэтычную ацэнку.

Пытанні эстэтычнага выхавання моладзі сёння як ніколі актуальныя, бо будучыню павінны ствараць культурныя людзі. Нельга гаварыць аб рашэнні эканамічных і сацыяльных праблем без уліку інтэлектуальнага патэнцыялу народа.

Уступаючы ў жыццё, малады чалавек атрымлівае ў спадчыну велізарны свет духоўных каштоўнасцей культуры і чалавечых адносін. Нават ход гісторыі немагчымы без перадачы новым пакаленням усіх дасягненняў чалавечай культуры.

Дзеячаў культуры Беларусі хвалюе пытанне аб адраджэнні народных традыцый, звычаяў, творчасці. Нацыянальнае мастацтва выяўляе сапраўдныя каштоўнасці жыцця і нясе іх новым пакаленням. Мацней за ўсё засваенню духоўных каштоўнасцей садзейнічае музычнае мастацтва.

Ідэя эстэтычнага выхавання моладзі пранізвае змест народнай творчасці. Беларуская музыка літаральна поўная эстэтычнага сэнсу, які надае кожнаму твору, незалежна ад яго жанру і зместу, высокае, сапраўды мастацкае гучанне.

Эстэтычны кантэкст беларускіх песень цесна ўзаемазвязаны з эстэтычнымі і маральнымі ўяўленнямі народа. Працоўныя, вясельныя, дзіцячыя, любоўна-лірычныя песні ўсхваляюць і праслаўляюць не толькі пачуцці кахання і прыгажосці, бацькоўскі дом, родныя мясціны; у гэтых творах эстэтычныя суб'екты валодаюць маральна-эстэтычнымі якасцямі - дабрынёй, сціпласцю, прыветлівасцю, вернасцю, шырынёй душы, гасціннасцю і гумарам.

Значнае месца ў фарміраванні эстэтычных густаў чалавека займаюць харавыя спевы. З'яўляючыся калектыўным відам творчасці, харавыя спевы дазваляюць дакрануцца да багацейшых скарбаў народнай музыкі, геніяльных твораў кампазітараў-класікаў.

Як паказаў аналіз прыкладаў нацыянальнага харавога мастацтва, выхаваўчыя магчымасці твораў невычарпальныя.

Багацце меладычных ліній, своеасаблівасць рытмічных малюнкаў, выразнасць і прывабнасць паэтычнага тэксту, глыбіня



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычнага і маральнага зместу ператвараюць беларускую харавую музыку ва ўзор высокага мастацтва, мастацтва, якое не губляе сваёй свежасці і актуальнасці. Валодаючы невычарпальным эстэтыка-выхаваўчым патэнцыялам, нацыянальнае харавое мастацтва можа і павінна служыць адным з асноўных сродкаў эстэтычнай адукацыі і выхавання ўдзельнікаў харавых калектываў.

Мастацтва народных харавых спеваў Беларусі мае шматвяковую традыцыю. Яно звязана з працоўнымі працэсамі сялян, зімнімі і веснавымі, летнімі і асеннімі святамі. Чалавек стварыў вялікую колькасць харавых песень, якія чаруюць багаццем музычных вобразаў, меладычнай дасканаласцю, дапамагаюць пазнаць свет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ